2. *Яненка Н. В.* Камунікатыўныя магчымасці білінгваў (на матэрыяле запісаў вуснага беларуска-рускага маўлення ў г.п. Хоцімску) // Актуальныя праблемы мовазнаўства і лінгвадыдактыкі: зб. навук. арт: у 2 ч. Ч. 2. Минск, 2012. С. 190–194.
3. *Яненка Н. В.* Моўцы перад выбарам варыянтаў асабовых займеннікаў 3-й асобы (на матэрыяле запісаў у гарадскім пасёлку Хоцімску) // Русский язык: система и функционирование (к 90-летию БГУ и 85-летию профессора П. П. Шубы): сб. матер. V Междунар. науч. конф. Минск, 2011. С. 377–380.

# ЛІТАРАТУРНЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ ПЕРШАЙ ТРЭЦІ XX СТАГОДДЗЯ І ІХ РОЛЯ Ў СТАНАЎЛЕННІ ЛІТАРАТУРНАГА ПРАЦЭСУ

**І. В. Ясюк**

У першае дзесяцігоддзе XX ст. беларуская літаратура пераходзіць на новы этап свайго развіцця. Гэта было выклікана самымі рознымі прычынамі, перадусім палітычнымі, дый сама мастацкая канцэпцыя патрабавала пэўных змен: новай тэматыкі, праблематыкі, якія б адпавядалі патрэбам часу. У пачатку XX ст. менавіта «Наша Ніва» давала шлях у жыццё шматлікім маладым беларускім літаратарам: на старонках газеты друкаваліся творы М. Гарэцкага, З. Бядулі і многіх іншых.[1] Так званае «поле ўлады»[2] «паслабляе кантроль» над агентамі «поля літаратуры», такім чынам, літаратура пачынае развівацца ў больш спрыяльных умовах. «З пункту гледжання аўтанамізацыі літаратурнага поля “нашаніўскі” перыяд, на першы погляд, уяўляецца прыкладам слабай аўтаноміі або ўвогуле этапам інстытуалізацыі літаратурнага поля. Сапраўды, вось літаратурнага беларускамоўнага свету – адно выданне, хай сабе і масавае, папулярнае, але, з іншага боку, нават не ўласналітаратурнае. Інстытуцыі, без якіх поле паўнавартасна не існуе, толькі ствараюцца. <…> З аднаго боку, дынаміка ўтварэння пэўных інстытуцый не можа не здзіўляць, з іншага – канцэнтрацыя і развітасць гэтых інстытуцый яшчэ недастатковая для паўнавартаснай аўтанамізацыі – калі параўноўваць той умоўнай нормай, якая існуе ў адфарміраваных еўрапейскіх літаратурах той пары» [6, с. 227, 228]. Нават пры гэтым пэўным чынам газета ўплывала на тое, у якім вектары

[1] «Ні адна з мэт, аднак, не ўдалася “Нашай Ніве” ў такой ступені, як асноўная мэта яе – мэта стварэння новай плеяды паэтаў, празаікаў, драматургаў. У кароткі тэрмін стварае яна цуд, вылучае дзясяткі пісьменнікаў з сялянскага і рабочага асяроддзя. Калі народныя выданні з’яўляюцца цяпер любімым тыпам беларускіх выданняў, то гэта, галоўным чынам, дзякуючы складу паэтаў і празаікаў, якіх “вывела на паверхню” газета «Наша Ніва» [4, с. 122].

[2] «Бурдзьё вызначае літаратуру або літаратурныя працэсы як «поле», якое знаходзіцца ва ўзаемадзеянні з іншымі сацыяльнымі палямі, перадусім з полем улады. Гэтае поле ўлады ён вызначае як поле сіл, у якім узаемадзейнічаюць эканамічныя, палітычныя, рэлігійныя і іншыя фактары, якія, да таго ж, вызначаюць структуру і развіццё ўсіх, у тым ліку і літаратурных, і іншых культурных палёў» [5, с. 124].

развівацца «новай»[3] беларускай літаратуры. Так, неабходна згадаць знакамітую нашаніўскую дыскусію паміж Юркам Верашчакам (Вацлавам Ластоўскім) і «адным з парнасьнікаў», што закранала пытанне будучыні тэматычнага поля беларускай літаратуры.

«Наша Ніва» заклала той падмурак, базіс, на якім у далейшым узрасце «новая» беларуская літаратура. Вельмі важна, што «Наша Ніва» давала матэрыял на беларускай мове. Гэта паўплывала на будучыню многіх пісьменнікаў, што спачатку цураліся сваёй мовы, пачынаючы пісаць па-руску, але пад уплывам тэндэнцыі, закладзенай «Нашай Нівай», пачыналі пісаць выключна па-беларуску.[4] Кропкай біфуркацыі для развіцця літаратуры стала важная сацыяльна-гістарычная падзея – рэвалюцыя, – якая «абнавіла» тэматыку твораў. У паслярэвалюцыйны час у літаратурнае жыццё ўступае генерацыя «маладнякоўцаў». У артыкуле «Ад беларускага літаратурна-мастацкага згуртаваньня «Узвышша» чытаем: «Творчасць маладых пісьменнікаў у першым кругабезе паслякастрычнікавай рэвалюцыі становіць адзін з фактараў палітычнага замацавання заваёў Кастрычніка на Беларусі і канчатковага разрыву і адмаўлення "ўсяго старога". Ажыццяўляючы літаратурным мастацтвам адзіную ідэю замацавання заваёў Кастрычніка, творчасць маладых пісьменнікаў утварае, проціваставячыся "старым" пісьменнікам, кірунак «маладнякізму» [7, с. 168][5]. Такім чынам, «Маладняк» ставіць задачу развіцця беларускай літаратуры ў межах «пралетарскага мыслення», апяванне рэвалюцыі, ідэя перамогі рабочых і сялян над капіталістамі, буржуазіяй у шырокім сэнсе, светлая будучыня і г.д. – усё гэта знаходзіць сваё адлюстраванне ў творчасці пісьменнікаў-маладнякоўцаў[6]. Можна згадаць, скажам, першыя апавяданні К. Чорнага (напрыклад «На граніцы» або «На варце»). У іх вельмі яскрава перададзены ідэі таго часу, выяўленне светлай будучыні чалавека пасля

---

[3]Тут і далей «новая» беларуская літаратура – генерацыя пісьменнікаў, якія прыйшлі ў літаратуру ў першае дзесяцігоддзе XX ст.

[4]Напрыклад, чытаем у Л. Клейнбарата: «У тым жа стылі піша мне Гартны, які пісаў па-руску. "Да гэтага часу я, як і многія іншыя, стараніўся і пазбягаў роднай мовы. Ува мне, як і ў многіх іншых, укаранілася думка, што беларуская мова гэта мова архаізму. І раптам усе паняцці па гэтым пытанні разляцеліся ўшчэнт! Газета на роднай мове! Апавяданні, вершы, артыкулы! Як па-мастацку і зразумела. І мяне пацягнула да роднай мовы. Я кінуў пісаць па-руску і цалкам заняўся служэнню літаратуры і грамадскасці свайго народа» [4, с. 124].

[5]«"На змену «старым» – з цяжарам мінулага на плячах – прыйшла новая літаратура ў сваёй ролі, ролі ўзбуджальніка і кіраўніка грамадска-нацыянальных пачаткаў. Бо пакуль Беларусь знаходзіцца ў стане росту, - новага грамадскага будаўніцтва, – значэнне яе, – хаця б так, у ідэі – не можа звужацца, памяньшацца. І – вы бачыце – кніга за кнігай закладваецца гэты новы этап»" [4, с. 333].

[6]Нататкі А.Бабарэкі: «Задача "Маладняка" – тварыць масавую літаратуру і шырока яе распаўсюджваць. "Маладняк шырока ўжо папулярызаваны і вядомы шырокім масам сялян і рабочых, асабліва рабоча-сялянскай моладзі. Значыць, трэба даць ім справу для мастацкага выхаваньня. Трэба задаволіць абуджаныя сярод рабоча-сялянскай моладзі запросы эстэтычныя» [3, с. 249].

рэвалюцыі. Літаратуразнаўца і крытык А.Бабарэка ў 1925 годзе так піша пра дасягненні «Маладняка»: «Гэта сьвята “Маладяка” з’яўляецца наогул сьвятам маладой пролетарскай беларускай культуры, якая за апошнія годы хутка й шырока пачала разьвівацца. Дзякуючы дапамозе ў гэтым разьвіцьці савецкай улады і комуністычнай партыі Беларусі беларуская культура ўжо заняла пэўнае месца сярод культур іншых народаў» [2, с. 106].

З цягам часу стала зразумела, што перспектывы, якія праграмавала рэвалюцыйная ідэалогія, перасталі задавальняць маладых пісьменнікаў. Пачынаецца паварот да пераасэнсавання рэчаіснасці, для больш сталага разумення падзей, а галоўным чынам вынікаў, што далі штуршок развіццю «новым» пісьменнікам. У сярэдзіне 20-х гг. XX ст. адбываецца першы раскол «Маладняка» (калі ўтвараецца літаратурна-мастацкае згуртаванне «Узвышша»), а пасля і другі раскол (утвараецца аб’яднанне «Пробліск» – пралетарска-сялянская беларуская літаратурная суполка). Рэшткі найбольш таленавітых пісьменнікаў перайшлі ў «Полымя», як, скажам, Міхась Зарэцкі.

1927 год – выходзіць першы нумар часопіса «Узвышша», на старонках якога надрукаваны артыкул «Ад беларускага літаратурна-мастацкага згуртаваньня “Узвышша”», а таксама Статут, у якім акрэслена кола «установуцаў»: Кузьма Чорны (М. Раманоўскі), А. Бабарэка, З. Бядуля (С. Плаўнік), В. Шашалевіч, Сяргей Дарожны (С. Серада), М. Лужанін (Ал. Каратай), Крапіва (К. Атраховіч), Глебка, Ул. Дубоўка, Я. Пушча (І. Плашчынскі). Як ужо адзначалася, некторыя з цяпершніх «узвышэнцаў» выйшлі са згуртавання «Маладняк». Паводле Л. Клейнбарта: «той самы Бабарэка, той самы Дубоўка, якія тлумачылі “новы этап” на папялішчы “адраджэнізму”, цяпер пішуць: “беларуская мастацкая літаратура складаецца <…> з творчасці маладых пісьменнікаў паслякастрычніцкай пары, якія, адштурхнуўшы дасягненні сваіх папярэднікаў, новых дасягненняў у большасці не далі”» [4, с. 368].

У сваім установчым артыкуле [7] напрыканцы першага нумара рэдкалегія часопіса, арганізатары згуртавання даюць ацэнку літаратурнаму працэсу першага дваццаціґоддзя XX ст. Можна прасачыць пэўную ідэалагічную іерархію: перадусім аналіз ідзе ад класікаў-«адраджэнцаў» праз «маладнякоўства» як рух, што не апраўдаў сваіх надзей, да ўзвышэнства. Сапраўды, «маладнякоўская» літаратура больш не адпавядала тым адчуваням, што склаліся ў маладых пісьменнікаў, праяўлялася пэўная ідыялізаванасць, магчыма нават наіўнасць. Але гэтага было недастаткова. L'art pour l'art (мастацтва дзеля мастацтва) – вось важная веха ў развіцці літаратуры. Неабходна не толькі ідэалагізаваць літаратуру, але і павышаць якасць, самакаштоўнасць,

эстэтычную вартасць мастацкага твора. Менавіта ў час «Узвышша» «новая» літаратура набывае небывалую веліч – росквіт не толькі змястоўнага плану, тэматыкі, праблематыкі, але і агульнае мастацкае афармленне – усё разам дае якасна іншыя творы. «Для пісьменнікаў “Узвышша” зыходны пунктам мастацкіх пошукаў было падкрэсленае разуменне жыцця як няспыннай плыні, руху, жыцця як дыялектыкі супярэчнасцей, хаця яны і не паспелі цалкам сцвердзіць гэта ў творчай практыцы. Заслуга пісьменнікаў “Узвышша” ў тым, што яны, як ніхто дагэтуль у гісторыі нашай літаратуры, завастрылі ўвагу на якасці мастацкай прадукцыі, як ніхто, смела ўзнялі гэтае пытанне на агульным рухам беларускай літаратуры ў яе поступе наперад» [8, с. 12]. Натуральна, што «зверху» трэба было кіраваць, назіраць за тым, што і як мае адбітак у іх творах. Але паводле Ант. Адамовіча, «у “Ўзвышшы” ня было ніводнага камуніста-партыйца, і паслаць яго туды было нельга: арыстакратычны прынцып здольнасьці не дапушчаў у арганізацыю бяздарнасьцяў, а нічога іншага ў камуністых, нажаль, ня было пад рукамі…» [1, с. 294]. Гэтая цытата з Ант. Адамовіча яшчэ раз даказвае тэзу пра імкненне “Узвышша” да дасканаласці твораў, да l'art pour l'art.

**Літаратура**


1. *Адамовіч А.* Узвышэнства як беларуская нацыянальная ідэялёгія // Адамовіч А. Да гісторыі беларускае літаратуры Мінск, 2005.
2. *Бабарэка А.* Збор твораў у 2 тамах: Том 1. Літаратурна-крытычныя працы. Вільня, 2011.
3. *Бабарэка А.* Збор твораў у 2 тамах: Том 2. Проза, паэзія, філязофія, публіцыстыка, запісныя кніжкі, дзёньнікі, лісты. Вільня, 2011.
4. *Клейнборт Л. М.* Молодая Белоруссия: Очерк современной белорусской литературы: 1905–1928 гг. Минск, 1928.
5. *Кандлі М.* Аўтаномія “малых” літаратур з пункту погляду тэорыі поля. // Погляды на спецыфічнасць “малых” літаратур: беларуская і ўкраінская літаратуры / уклад. Гун-Брыт Колер, Павел Навуменка. Мінск, 2012.
6. *Навуменка П.* Літаратурныя аб’яднанні першай трэці XX стагоддзя як цэнтры кансалідацыі літаратурных сіл і стваральнікі перадумоў аўтанамізацыі // Погляды на спецыфічнасць “малых” літаратур: беларуская і ўкраінская літаратуры / уклад. Гун-Брыт Колер, Павел Навуменка. Мінск, 2012.
7. Узвышша. Часопіс літаратуры, мастацтва і крытыкі. 1927. №1. / Факсімільнае выданне / прадм. П.І. Навуменкі. Мінск, 2007. С. 168–170.
8. *Чыгрын І. П.* Крокі: проза “Узвышша”. Мінск, 1989.